# Школьны праект «70 добрых спраў»

**Л. У. Скрабец,**
настаўнік нямецкай і французскай мовы вышэйшай катэгорыі
**Марына Ляшук,**
вучаніца 10 класа

## Назва праекта

70 добрых спраў

## Тэрміны рэалізацыі праекта

Падрыхтоўчы этап – верасень 2014 года
Практычны этап – кастрычнік 2014 года – май 2015 года
Кантрольна-ацэначны этап – чэрвень 2015 года

## Мэта праекта

Стварэнне ўмоў для ўдасканалення работы ўстановы адукацыі па арганізацыі выхаваўчага працэсу, накіраванага на грамадзянска-патрыятычнае выхаванне школьнікаў, праз выкарыстанне патэнцыялу шостага школьнага дня.

## Задачы праекта

- Стварыць умовы для павышэння ініцыятыўнасці вучняў, удасканалення работы органаў вучнёўскага самакіравання ў працэсе правядзення выхаваўчых мерапрыемстваў, арганізацыі грамадска карыснай дзейнасці ў шосты школьны дзень.

- Садзейнічаць павышэнню нацыянальнай свядомасці, грамадзянскай актыўнасці вучняў і агульнага ўзроўню выхаванасці.

- Павысіць кампетэнтнасць педагогаў у пытаннях патрыятычнага і грамадзянскага выхавання.

- Напрацаваць і сістэматызаваць матэрыял па нацыянальна-грамадзянскім і патрыятычным выхаванні ў шосты школьны дзень.

- Стварыць сістэму работы па грамадзянска-патрыятычным выхаванні вучняў у шосты школьны дзень.

## Мэтавыя групы

вучні 5-11 класаў;
члены грамадскіх аб'яднанняў "БРПА", "БРСМ";
педагогі ўстановы адукацыі.

## Рэзультаты праекта

- павышэнне ініцыятыўнасці вучняў пры арганізацыі дасугавай дзейнасці;
- актывізацыя дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў "БРПА", "БРСМ", іншых органаў вучнёўскага самакіравання;
- павышэнне нацыянальнай свядомасці, грамадзянскай актыўнасці вучняў і агульнага ўзроўню іх выхаванасці;
- павышэнне кампетэнтнасці педагогаў у пытаннях патрыятычнага і грамадзянскага выхавання;
- стварэнне сістэмы грамадзянска-патрыятычнага выхавання вучняў у шосты школьны дзень;
- абагульнены вопыт педагогаў па арганізацыі суботняга дасуга школьнікаў, ажыццяўляецца яго трансляцыя ў адукацыйную практыку.

## Абгрунтаванне неабходнасці рэалізацыі праекта

Згодна Кодэксу Рэспублікі Беларусь аб адукацыі задачай выхавання ва ўстановах адукацыі з'яўляецца "фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі". [1, с. 20]

У адпаведнасці з Канцэпцыяй бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнцкай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь у сучасных соцыякультурных умовах адным з асноўных састаўляючых выхавання з'яўляецца грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі. [2, с. 5]

Роля і значэнне патрыятычнага і нацыянальна-грамадзянскага выхавання на сучасным этапе ўзрастае. Сучасная сацыяльная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь характарызуецца сацыяльнай дыферэнцыяцыяй грамадства, зніжэннем выхаваўчага ўздзеяння гісторыка-культурных каштоўнасцей, мастацтва і адукацыі, як важны фактар фарміравання патрыятызму.

Усё гэта накладвае адбітак на стаўленне дзяцей да жыцця, сям'і, свайго народа, дзяржавы і яе інстытутаў. У гэтых умовах відавочна неабходнасць узмацнення ролі выхавання, перш за ўсё выхаванне патрыятызму і

нацыянальнай свядомасці як асновы кансалідацыі грамадства і ўмацавання дзяржавы.

У сувязі з шэрагам праблем і пытанняў, з якімі сутыкаецца штодзень сучанае грамадства, установы адукацыі павінны выступаць як цэнтры выхаваўчай і сацыякультурнай дзейнасці. Сёння адной з важных задач, якія стаяць перад педагагічнымі калектывамі ўстаноў адукацыі, з’яўляецца арганізацыя выхаваўчай работы ў шосты школьны дзень вучэбнага тыдня.

Напаўненне патрыятычнага і нацыянальна-грамадзянскага выхавання новым зместам павінна ажыццяўляцца з улікам рэгіянальных асаблівасцей. Менш развітая ў параўнанні з горадам сацыякультурная інфраструктура сяла (адсутнасць тэатраў, музеяў, канцэртных і выставачных залаў, спартыўных збудаванняў, недастатковае развіццё сеткі пазашкольных устаноў, бібліятэк і інш.) абмяжоўвае спектр дасугавай дзейнасці і абумоўлівае спецыфіку выхаваўчай работы ў шосты школьны дзень.

У нашай установе адукацыі створана сістэма выхаваўчай работы, якая накіравана на рашэнне задач грамадзянска-патрыятычнага выхавання, у тым ліку з выкарыстаннем патэнцыялу шостага школьнага дня. Вучням прапануюцца разнастайныя мерапрыемствы, накіраваныя на замацаванне іх фізічнага і маральнага здароўя, інтэлектуальнага развіцця і асобаснага росту. Практычнае рашэнне задачы па выхаванні грамадзяніна-патрыёта ажыццяўляецца ў цесным кантакце “вучань+настаўнік+соцыум”.

## Асноўныя этапы і віды дзейнасці па праекце

### *Падрыхтоўчы этап*

1. Дакументальнае афармленне дзейнасці на ўзроўні ўстановы адукацыі.

2. Распрацоўка праграмы дзейнасці.

3. Вызначэнне зместу і форм маніторынгу, форм афармлення хода і рэзультатаў.

4. Фіксіраванне пачатковага стану дзейнасці ўстановы адукацыі ў адпаведнасці з пэўнымі крытэрыямі і паказчыкамі.

5. Стварэнне ўмоў (арганізацыйных, інфармацыйных, метадычных, матэрыяльна-тэхнічных, псіхалагічных), якія забяспечваюць эфектыўнасць і якасць укаранення праекта.

### *Этап рэалізацыі праекта*

1. Арганізацыя работы па выкананні планаў дзейнасці праекта.

2. Маніторынг працэса прамежкавых рэзультатаў дзейнасці праекта.

3. Карэкцыя і рэгуляванне дзейнасці праекта.

4. Непасрэдная распрацоўка сістэмы работы праекта.

5. Метадычная падтрымка ўдзельнікаў праекта.

6. Даследванне эфектыўнасці выніковых рэзультатаў дзейнасці праекта.

*Абагульняючы этап*

1. Вывучэнне, апрацоўка і абагульненне рэзультатаў па распрацоўцы сістэмы работы праекта.

2. Аналіз эфектыўнасці дзейнасці праекта.

3. Сістэматызацыя і афармленне матэрыялаў, назапашаных у выніку рэалізацыі праекта.

## План рэалізацыі праекта

| № п/п | Змест работы | Тэрміны | Адказныя |
|---|---|---|---|
| **Падрыхтоўчы этап** | | | |
| 1 | Вытворчая нарада “Каардынацыя дзейнасці ўдзельнікаў праекта” | верасень | Арыновіч В.П., нам. дыр. па выхаваўчай рабоце |
| 2 | Сістэматызацыя навукова-метадычнага забеспячэння па тэме праекта | верасень | Арыновіч В.П., нам. дыр. па выхаваўчай рабоце |
| 3 | Састаўленне плана работы па рэалізацыі практычнага этапа праекта | верасень | Арыновіч В.П., нам. дыр. па выхаваўчай рабоце |
| 4 | Распрацоўка сістэмы дыягностыкі ўзроўня выхаванасці школьнікаў (патрыятычнае і нацыянальна-грамадзянскае выхаванне) | верасень | каардын.савет |
| 5 | Індывідуальнае кансультаванне | верасень | каардын.савет |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | ўдзельнікаў праекта | | |
| **Практычны этап** | | | |
| *Арганізацыйна-метадычныя мерапрыемствы* | | | |
| 1 | Стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць метадычную падрыхтоўку педагогаў | верасень | Арыновіч В.П., нам. дыр. па выхаваўчай рабоце |
| 2 | Правядзенне тлумачальнай работы з бацькамі, прадстаўнікамі грамадскасці аб актуальнасці рэалізацыі праекта | верасень-кастрычнік | класныя кіраўнікі |
| 3 | Вывучэнне вопыту работы па абранай праблеме іншых устаноў адукацыі Столінскага раёна | на працягу года | Арыновіч В.П., нам. дыр. па выхаваўчай рабоце, класныя кіраўнікі |
| 4 | Маніторынг працэсу прамежкавых рэзультатаў дзейнасці па рэалізацыі праекта | чэрвень | каардын.савет |
| *Выхаваўчыя мерапрыемствы* | | | |
| | Раздзел І. Культурна-дасугавы накірунак<br>Дзейнасць атрада “Крэатыў” | | |
| 1 | Удзел у раённых конкусах па патрыятычным выхаванні, прысвечаных 70-годдзю са Дня Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі | на працягу года | класныя кіраўнікі, савет атрада “Крэатыў” |
| 2 | Прыём вучняў 5 класа ў члены грамадскага аб’яднання “БРПА” | верасень | Вярэніч А.У., пед.-арг., савет дружыны |
| 3 | Выстава матэрыялаў ”Памяць за сабою пакліч” | кастрычнік | Ляшук Л.В., бібліятэкар, савет атрада “Крэатыў” |
| 4 | Конкурс юных чытальнікаў “Гэта патрэбна жывым” | кастрычнік | Ляшук Л.В., бібліятэкар, савет атрада “Крэатыў” |
| 5 | Віктарына “Гісторыя Узброеных сіл Беларусі” | лістапад | Вярэніч А.У., педагог |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | сацыяльны, пед.-арг., савет атрада “Крэатыў” |
| 6 | Проба пяра “Пісьмо герою вайны” | лістапад | Ляшук Л.В., бібліятэкар, савет атрада “Крэатыў” |
| 7 | Літаратурна-музычная кампазіцыя “Свет партызанскіх кастроў” | лістапад | Скрабец П.М., кл.кір.5 кл., савет атрада “Крэатыў” |
| 8 | Прэзентацыя “Яны пісалі аб вайне” | снежань | Ляшук Л.В., бібліятэкар, савет атрада “Крэатыў” |
| 9 | Ролевая гульня. Наведванне выставы карцін М.Савіцкага “Лічбы на сэрцы” | снежань | Скрабец Л.У., кл.кір. 7 кл., савет атрада “Крэатыў” |
| 10 | Панарама “Ахвяры Халакоста” | снежань | Ляшук Л.В., бібліятэкар, савет атрада “Крэатыў” |
| 11 | “Помнікі Столінскага раёна” Экскурсія па старонках кнігі “Памяць” | студзень | Ляшук Л.В., бібліятэкар, савет атрада “Крэатыў” |
| 12 | Конкурс прэзентацый “Маршруты славы Століншчыны” | люты | Ляшук Л.В., бібліятэкар, савет атрада “Крэатыў” |
| 13 | Выстава кніг “Крокі Вялікай Перамогі” | люты | Ляшук Л.В., бібліятэкар, савет атрада “Крэатыў” |
| 14 | Забаўляльна-пазнаваўчая праграма “Памяці прадзедаў будзем дастойны” | люты | класныя кіраўнікі, савет атрада “Крэатыў” |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 15 | Вусны часопіс “Старонка з жыцця ветэрана” | сакавік | класныя кіраўнікі, савет атрада “Крэатыў” |
| 16 | Конкурс юных паэтаў “Подзвігу жыць у вяках” | сакавік | Ляшук Л.В., бібліятэкар, савет атрада “Крэатыў” |
| 17 | Удзел у раённым конкурсе сачыненняў “У вайны не жаночы твар”, прысвечаным 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. | красавік | класныя кіраўнікі, савет атрада “Крэатыў” |
| 18 | Удзел у раённым конкурсе эсэ “Вялікая Айчынная вайна ў лёсе маёй сям’і” | красавік | Ханавец С.І., кл.кір. 11 кл., савет атрада “Крэатыў” |
| 19 | Прагляд відэафільмаў “Вайна. Народ. Перамога.” | красавік-май | Вярэніч А.У., педагог сацыяльны, пед.-арг., савет атрада “Крэатыў” |
| 20 | Фотавыстава “Маршруты баявой славы” | красавік | класныя кіраўнікі, савет атрада “Крэатыў” |
| 21 | “Вялікай Перамозе – 70!” Выпуск школьнай газеты “Люстэрка” | май | Вярэніч А.У., педагог сацыяльны, пед.-арг., савет атрада “Крэатыў” |
| 22 | Прыём вучняў 8, 9 класаў у члены грамадскага аб’яднання “БРСМ” | май | Галік А.Я., сакратар пярвічнай арганізацыі |
| 23 | Вахта Памяці | май | Вярэніч А.У., педагог сацыяльны, пед.-арг., |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | савет атрада “Крэатыў” |
| 24 | Мітынг, прысвечаны 70-годдзю са Дня Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі | май | Вярэніч А.У., педагог сацыяльны, пед.-арг., савет атрада “Крэатыў” |
| 25 | Канцэртная праграма да Дня Перамогі “Героям Радзімы – слава!” | май | Вярэніч А.У., педагог сацыяльны, пед.-арг., савет атрада “Крэатыў” |
| 26 | Сустрэча з выпускніком Лядзецкай сярэдняй школы, мастаком У.Уроднічам “Дарогай памяці” | май | Скрабец Л.У., кл.кір. 7 кл., савет атрада “Крэатыў” |
| 27 | Конкурс інтэрв’ю “Дзеці вайны” (аповеды родных і блізкіх, дзяцей, якія перажылі падзеі вайны) | красавік | класныя кіраўнікі, савет атрада “Крэатыў” |
| 28 | Конкурс прэзентацыйных работ “Перамога прадзедаў і дзядоў” | красавік | класныя кіраўнікі, савет атрада “Крэатыў” |
| 29 | Цыкл мерапрыемстваў “Дзяцінства, апаленае вайной”, прысвечаны 70-годдзю Вялікай Перамогі | май | класныя кіраўнікі, савет атрада “Крэатыў” |
| 30 | Святочнае ўручэнне пашпартоў і кнігі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка вучням установы адукацыі | на працягу года | савет “БРСМ”, савет атрада “Крэатыў” |
| 31 | Узлажэнне кветак выпускнікамі ўстановы адукацыі да помніка аднавяскоўцаў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны | чэрвень | Ханавец С.І., кл.кір. 11 кл., савет атрада “Крэатыў” |
| | Раздзел ІІ. Пошукава-даследчы накірунак<br>Дзейнасць атрада “Пошук” | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 32 | Сустрэча (выезд на дом) з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны Стахаўцом Віталіем Барысавічам | май | Царык С.Г., наст. гіст., савет атрада “Пошук” |
| 33 | Выданне зборніка “Творы майго жыцця” (вершы, песні, музака Стахаўца Віталія Барысавіча) | май | Царык С.Г., наст. гіст., савет атрада “Пошук” |
| 34 | Сустрэча (выезд на дом) з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны Буранковым Фёдарам Герасімавічам | май | Царык С.Г., наст. гіст., савет атрада “Пошук” |
| 35 | Фіксацыя гістарычных успамінаў “Шлях да Перамогі” ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Буранкова Фёдараа Герасімавіча | на працягу года | Царык С.Г., наст. гіст., савет атрада “Пошук” |
| 36 | Даследаванне “Тэматыка Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці У.Уродніча” | кастрычнік | Скрабец Л.У., кл.кір. 7 кл., савет атрада “Пошук” |
| 37 | Удзел Шыкунца Аляксея, вучня 8 класа, у першым этапе абласнога патрытычнага марафона “Вазьмі, мой унук, у спадчыну памяць”. Навукова-даследчая работа “Сям’я Панчанка – прыклад самаадданага служэння сваёй справе і народу” | кастрычнік | Царык С.Г., наст. гіст., савет атрада “Пошук” |
| 38 | Удзел Ляшук Марыны, вучаніцы 10 класа ў навукова-даследчай канферэнцыі “Адкрываю свет – адкрываю сябе”. Навукова-даследчая работа “Уладзімір Уродніч – мастак, грамадзянін, патрыёт Століншчыны” | сакавік | Скрабец Л.У., кл.кір. 7 кл., савет атрада “Пошук” |
| 39 | Пошукавая работа “Вайна ў лёсе маіх аднавяскоўцаў” | на працягу года | класныя кіраўнікі, савет атрада “Пошук” |
| 40 | Афармленне альбома памяці “Аднавяскоўцы, загінуўшыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны” | на працягу года | класныя кіраўнікі, савет атрада |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | “Пошук” |
| 41 | Пісьмовая і відэафіксацыя ўспамінаў ўдавы вязня канцлагера Чырэц Вольгі Самуілаўны “Лісты з далёкага мінулага” | сакавік | Царык С.Г., наст. гіст., савет атрада “Пошук” |
| 42 | Сустрэча з Ляшук Марыяй Пятроўнай, малалетнім вязнем | красавік | Скрабец Л.У., кл.кір. 7 кл., савет атрада “Пошук” |
| 43 | Удзел у другім этапе абласнога патрыятычнага марафона “Вазьмі, мой унук, у спадчыну памяць” вучняў установы адукацыі Шыкунца Аляксея, Ляшкевіч Ганны | май | Царык С.Г., наст. гіст., савет атрада “Пошук” |
| | Раздзел III. Валанцёрскі накірунак Дзейнасць атрада “Міласэрнасць” | | |
| 44 | Аказанне дапамогі ў сельска-гаспадарчых работах ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і вязням | на працягу года | Вярэніч А.У., педагог сацыяльны, пед.-арг., савет атрада “Міласэрнасць” |
| 45 | Акцыя “Памяці герояў будзем дастойны” (догляд магіл ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | на працягу года | Вярэніч А.У., педагог сацыяльны, пед.-арг., савет атрада “Міласэрнасць” |
| 46 | Акцыя “Ветэран жыве побач” (добраўпарадкаванне прысядзібных тэрыторый) | на працягу года | Вярэніч А.У., педагог сацыяльны, пед.-арг., савет атрада “Міласэрнасць” |
| 47 | Працоўны дэсант “Зберагчы як спадчыну” | на працягу года | класныя кіраўнікі, савет атрада “Міласэрнасць” |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 48 | Сацыяльна-значымая акцыя “Падарунак ветэрану сваімі рукамі” | люты, май | класныя кіраўнікі, савет атрада “Міласэрнасць” |
| 49 | Акцыя “Пасадзі дрэва з ветэранам” | красавік | Вярэніч А.У., педагог сацыяльны, савет атрада “Міласэрнасць” |
| 50 | Экалагічная акцыя “Кветкі Перамогі” | красавік-май | класныя кіраўнікі, савет атрада “Міласэрнасць” |
| 51 | Акцыя “Абеліск” | на працягу года | Вярэніч А.У., педагог сацыяльны, савет атрада “Міласэрнасць” |
| 52 | Акцыя “Добрай раніцы, ветэран” (паштоўка для ветэрана) | май | Вярэніч А.У., педагог сацыяльны, савет атрада “Міласэрнасць” |
| | Раздзел IV. Краязнаўча-турыстычны накірунак<br>Дзейнасць атрада “Рабінзоны” | | |
| 53 | Турыстычны паход па маршруту “Лядзец-Беражное-Рыбнікі-Белавуша-Лядзец” | кастрычнік | Вярэніч А.У., пед.-арг., савет атрада “Рабінзоны” |
| 54 | Экскурсія па маршруту “Лядзец –в. Вялікія Арлы – гістарычны помнік Нова-Беражное-Беражное-Лядзец” | чэрвень | Вярэніч А.У., пед.-арг., савет атрада “Рабінзоны” |
| 55 | Экскурсія ў музей баявой славы 212-й Крычаўскай чырвонасцяжнай ордэна Суворава і Кутузава стралковай дывізіі (Фядорская сярэдняя школа) | | Вярэніч А.У., пед.-арг., савет атрада “Рабінзоны” |
| 56 | Удзел у раённых турыстычных спаборніцтвах | красавік | Вярэніч А.У., пед.-арг., савет атрада |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | “Рабінзоны” |
| | Раздзел V. Спартыўна-аздараўленчы накірунак.<br>Дзейнасць клуба “Юны алімпіец” | | |
| 57 | Малыя алімпійскія гульні | верасень | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |
| 58 | Спаборніцтвы па комплексу “Абаронца Айчыны”, прысвечаныя 70-ай гадавіне Перамогі | кастрычнік | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |
| 59 | Спартландыя “Сябруем са спортам” | лістапад | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |
| 60 | Лыжныя спаборніцтвы | снежань | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |
| 61 | Спаборніцтвы па стральбе ў гонар 70-годдзя Вялікай Перамогі | студзень | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |
| 62 | Асабістае першынство па настольным тэнісе на прыз ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Стахаўца Віталія Барысавіча | люты | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |
| 63 | Конкурсная праграма “Юныя абаронцы Айчыны” | люты | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |
| 64 | Спартыўна-патрыятычная гульня “Зарніца” | сакавік | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | савет клуба “Юны алімпіец” |
| 65 | Спартыўнае свята “Спрытныя. Лоўкія. Смелыя” | сакавік | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |
| 66 | Спартакіяда “Памяць” | красавік | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |
| 67 | Ваенна-спартыўная эстафета да Дня Перамогі | красавік | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |
| 68 | Таварыская сустрэча па футболе з вучнямі Арлоўскай сярэдняй школы | май | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |
| 69 | Валейбольны турнір паміж настаўнікамі і вучнямі | май | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |
| 70 | Спартландыя “Шчаслівае дзяцінства”, прысвечаная Дню абароны дзяцей | чэрвень | Ляшук М.Л., наст. фіз.культ., савет клуба “Юны алімпіец” |

**Неабходныя рэсурсы па рэалізацыі праекта**

- Нарматыўныя прававыя (распрацоўка праекта, план рэалізацыі праекта, распрацоўка лакальных палажэнняў, экспертыза дакументацыі і зацвярджэнне).

- Арганізацыйныя (стварэнне ініцыятыўнай групы, інструктыўна-метадычныя нарады з педагогамі, кансультацыі для членаў савета піянерскай дружыны і савета старшакласнікаў).

- Інфармацыйныя (вывучэнне і абмен вопытам работы па праекце іншых установў адукацыі раёна, вобласці, арганізацыя і правядзенне семінараў, кансультацый, інфармацыйная падтрымка педагогаў, бацькоў і вучняў, тлумачальная работа з бацькамі).

- Кадравыя (настаўнікі, класныя кіраўнікі, педагог сацыяльны, педагог-арганізатар, бібліятэкар, педагогі дадатковай адукацыі).

- Матывацыйныя (матэрыяльнае стымуляванне спецыялістаў, ацэнка эфектыўнасці дзейнасці педагогаў на аснове паказчыкаў і крытэрыяў якасці выхавання, сістэма заахвочвання бацькоў і вучняў).

- Навукова-метадычныя (унясенне змяненняў у змест метадычнай работы ў адпаведнасці з планам рэалізацыі праекта).

- Матэрыяльна-тэхнічныя (праграмна-тэхналагічнае забеспячэнне, матэрыяльна-тэхнічная база ўстановы адукацыі).

**Сістэма ацэнкі і маніторынг рэалізацыі праекта**

Мэта: ацэнка эфектыўнасці дзейнасці па рэалізацыі праекта “70 добрых спраў”

- Аналіз актыўнасці ўдзелу вучняў і аб’ектаў соцыуму ў мерапрыемствах шостага школьнага дня.
- Маніторынг узроўня выхаванасці вучняў.
- Маніторынг псіхічнага і фізічнага здароўя вучняў.
- Маніторынг прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў.
- Задаволенасць удзельнікаў праекта рэзультатамі яго ўкаранення.
- Якасць кіравання праектам.

**Дадатак**

## Конкурсная праграма
## “Юныя абаронцы Айчыны”







**Спартландыя**
**“Сябруем са спортам”**









**Забаўляльна-пазнаваўчая праграма**
**“Памяці прадзедаў будзем дастойны”**








**Спартыўнае свята**
**“Спрытныя. Лоўкія. Смелыя”**







**Сустрэча з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны Стахаўцом Віталіем Барысавічам**







## Выданне зборніка “Творы майго жыцця”
## (вершы, песні, музыка Стахаўца В.Б.)






РАССКАЖИ, ВЕТЕРАН.

Музыка В. Стаховец    Слова А. Володкевич

1. Расскажи, ветеран, слова с памяти просятся сами.
Расскажи, с кем и где ты в атаки ходил.
Посиди, ветеран, как любил посидеть с сыновьями
С нами, дважды рождённый, ты, отец, посиди.

2. Этот дым фронтовой побелил ветеранам головы
И все пули войны мимо сердца прошли.
Расскажи, ветеран, само в памяти просится слово Чтобы
детям об этом рассказать мы могли.

3. Чтобы эту войну нам пройти, надо сердце из стали,
Надо быть и штыком, и свинцом, и бронёй.
Посмотри, ветеран, твои внуки уж взрослыми стали,
Заслонившие войну, будут вечно с тобой.

## Сустрэча
## з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны
## Буранковым Фёдарам Герасімавічам







**Сустрэча “Дарогай памяці”**
**з выпускнікам Лядзецкай сярэдняй школы,**
**мастаком  У.Уроднічам**







**Экалагічная акцыя**
**“Кветкі Перамогі”**









**Сацыядзьна-значымая акцыя**
**“Падарунак ветэрану сваімі рукамі”**





**Працоўны дэсант**
**“Зберагчы як спадчыну”**











**Аказанне дапамогі**
**ў сельска-гаспадарчых работах**
**ветэранам Вялікай Айчыннай вайны**





## Акцыя
## “Ветэран жыве побач”



## Навукова-даследчая дзейнасць











**Удзел Шыкунец Людмілы, вучаніцы 7 класа, у раённым конкурсе сачыненняў “У вайны не жаночы твар”, прысвечаным 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне**



ОТДЕЛ ОБРАЗОВАНИЯ, СПОРТА И ТУРИЗМА СТОЛИНСКОГО РАЙОННОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА

70 лет ВЕЛИКОЙ ПОБЕДЫ

ДИПЛОМ

награждается

ШИКУНЕЦ Людмила,

государственное учреждение образования

за победу в районном конкурсе сочинений “У войны не женское лицо”, посвященном 70-летию Победы в Великой Отечественной войне.

Начальник отдела



26 мая 2015 года 3





У вайны не жаночы твар

Удзел Шыкунца Аляксея, вучня 8 класа, у першым этапе абласнога патрытычнага марафона “Вазьмі, мой унук, у спадчыну памяць”
Навукова-даследчая работа “Сям’я Панчанка – прыклад самаадданага служэння сваёй справе і народу”










**Удзел у другім этапе абласнога патрыятычнага марафона “Вазьмі, мой унук, у спадчыну памяць” вучняў установы адукацыі Шыкунца Аляксея, Ляшкевіч Ганны**







**Удзел Ляшук Марыны, вучаніцы 10 класа у навукова-даследчай канферэнцыі “Адкрываю свет – адкрываю сябе”.**

**Навукова-даследчая работа “Уладзімір Уродніч – мастак, грамадзянін, патрыёт Століншчыны”**



**Цыкл мерапрыемстваў**
**“Дяцінства, апаленае вайной”,**
**прысвечаны 70-годдзю Вялікай Перамогі**












**Выпуск школьнай газеты "Люстэрка"**



**Віктарына**
**"Гісторыя Узброеных сіл Беларусі"**





**Удзел**

**у раённых турыстычных спаборніцтвах**









**Мітынг,**
**прысвечаны 70-годдзю**
**са Дня Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі**










**Вахта Памяці**




194